гарвыканкама, бел. арганістка і піяністка К.Пагарэлая. Асн. мэты фестывалю — папулярызацыя выканальніцкага майстэрства бел. музыкантаў, развіццё творчых сувязей з арганістамі замежных краін, знаёмства шырокай аўдыторыі са спадчынай кампазітараў-класікаў, творчасцю сучасных музыкантаў Беларусі, блізкага і далёкага замежжа. Фестывальныя праграмы праходзяць у канцэртнай зале (адкрыта ў 1983) Полацкага Сафійскага сабора, для якога спецыяльна быў сканструяваны і ўстаноўлены арган чэшскай фірмы «Rieger Kloss». Удзельнікамі канцэртаў сталі музыканты з 17 краін свету (Аўстрыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Даніі, Латвіі, Літвы, Нідэрландаў, Польшчы, Расіі, Украіны, Фінляндыі, Францыі, Швейцарыі і інш.). Сярод бел. удзельнікаў: І.Алоўнікаў, У.Неўдах, К.Пагарэлая, К.Шароў, Дзярж. камерны аркестр Рэспублікі Беларусь, Мінскі камерны квартэт, муз. капэла «Санорус», акадэмічны хор Нац. дзярж. тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь і інш. У 1996 на фестывальнай сцэне музіцыравалі першы выканаўца на аргане Сафійскага сабора А.Янчанка, М.Павалій (Расія), Ё.Трумер (Аўстрыя), В.Вебер-Геркен (Германія), К.Пагарэлая, віяланчэліст А.Алоўнікаў (Беларусь). У 2008 форум быў прысвечаны 370-годдзю з дня нараджэння ням. кампазітара-арганіста Д.Букстэхудэ, творы якога, а таксама музыка інш. аўтараў прагучалі ў выкананні Г.Х.Хейна (Данія), Э.Кароляка і Д.Гайдукевіча (Польша), А.Візгерхофа (Нідэрланды), Л.Шышханавай (Расія) і інш. У 2009 фестываль «З.С.» прысвячаўся памяці М.Ільніцкага, б. дырэктара Полацкага Нац. гісторыка-культ. запаведніка. Выступалі К.Лявонцьева (Расія—Германія), Ю.Тамінен (Фінляндыя), П.Оверкерк (Нідэрланды) і інш. У 2011 форум праводзіўся ў рамках рэсп. Акцыі «Полацк — культурная сталіца Беларусі» і быў прысвечаны 25-годдзю аргана Полацкага Сафійскага сабора. Канцэртную праграму прадстаўлялі польск. Музыкант, гал. Арганіст Гданьскага кафедральнага сабора Р.Пяруцкі, бел. арганістка і кампазітар В.Падгайская сумесна з сімф. Аркестрам Белрадыёкампаніі і дырыжорам Ч.Грабоўскім (Польшча), а таксама К.Пагарэлая разам з муз. Капэлай «Санорус» і камерным аркестрам «Еўропа-Цэнтр» пад кіраўніцтвам дырыжора Р.Садыкава.

*В.Р.Гудзей-Каштальян.*

**ЗВАР**, 1) падліва з канаплянага семя (маку), якое расціралі і заварвалі. Спажывалі як посную прыправу. З. пашыраны на тэр. Зах. Палесся. 2) Абрадавая страва, якую прыносілі жанчыне-парадзісе ў час *адведак*. Уяўляла сабой адвар з сухафруктаў (яблык, груш, чарніц). У якасці абрадавай стравы ў наш час зрэдку сустракаецца на Палессі.

**ЗВАРО́ТАК**, граматычна незалежны і інтанацыйна абасоблены кампанент сказа або складанага сінтаксічнага цэлага, які абазначае асобу ці прадмет, якому адрасавана маўленне. З. выражаецца назоўнікам, займеннікам, субстантываваным прыметнікам або эквівалентнымі ім словазлучэннямі. З., выражаны займеннікам, інтанацыйна можа зліваццца з інш. Словамі канструкцыі («Ды пачакайце ж вы!» К.Чорны). З. бываюць неразвітыя і развітыя, могуць размяшчацца ў пачатку, сярэдзіне і канцы сказа («М а я  м о в а, ідзі да людзей — ад святла да начы і да ранку!» В.Аколава; «О, В і л ь н я, крывіцкая Мекка, о, м е с т а, — усё цуд, хараство!» У.Жылка; «Але куды ты, д у м к а - н е п а с е д а? Чаму крычыш, с п а к о й н а я  д у ш а?» Я.Янішчыц). Для З. характэрны розныя тыпы інтанацыі: 1) клічная, 2) закліку, 3) уводнасці (паніжэнне голасу, паскораны тэмп маўлення). Могуць даваць ацэначную характарыстыку, выражаць адносіны гаворачага да суразмоўцы («Хутчэй шавяліся, в о л  п а д ' я р э м н ы!» Л.Дайнека).

*Д.В.Дзятко.*

**ЗВЕЗДАРЫ**, група вясковай моладзі (пераважна падлеткі і дзеці), якая паводле старадаўняга звычаю на *Каляды* хадзіла ад хаты да хаты з песнямі,



*Да арт. Звездары. Каляды ў танцавальна-аздараўленчым цэнтры рэабілітацыі інвалідаў у пас. Калодзішчы Мінскага раёна. 2012.*